


# Крок да прафесіі

**Адзіны дзень адчыненых дзвярэй у рамках агульнарэспубліканскай акцыі "Я выбіраю прафесію" запланаваны на 22 сакавіка. У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў мерапрыемства пройдзе другі раз: насычаная праграма чакала тут абітурыентаў і на пачатку месяца.**

Святочная атмасфера панавала ў спартыўна-культурным цэнтры ўніверсітэта з самага ранку. Гасцей сустракалі творчыя калектывы, вясёлыя клоўны і ветлівыя валанцёры, якія раздавалі квіткі латарэі і дапамагалі з навігацыяй.

Урачыстае адкрыццё абвясціў "Гімн БДУКМ" у выкананні моладзевага сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Анатоля Кудзіна і вакальнай групы "Універсум". З прывітальным словам да гасцей звярнулася рэктар Наталля Карчэўская, якая распавяла пра адукацыйныя праграмы, перспектывы для выпускнікоў. Пасля афіцыйнай часткі абітурыенты з бацькамі змаглі наведаць інтэрактыўныя пляцоўкі, што арганізавалі факультэты і студэнцкія арганізацыі. Шмат каго зацікавілі майстар-класы па грыме, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве, танцавальнай аэробіцы, выканальніцкім мастацтве. Прыцягнула ўвагу школьнікаў і прэзентацыя курсаў падрыхтоўкі да ўступных іспытаў. Тэматычныя фотазоны, віктарыны, гульні і дэгустацыя кандытарскай прадукцыі з універсітэцкай сталовай — усё красамоўна распавядала пра перавагі навучання ў БДУКМ.

Не менш карысным мусіць быць і мерапрыемства 22 сакавіка. Пагутарыць з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў, даведацца аб усіх тонкасцях унутранага экзамену "творчасць", высветліць асаблівасці паступлення па мэтавым дагаворы — адказы на гэтыя і іншыя пытанні, а таксама яскравыя ўражанні дапамогуць абітурыентам прыняць правільнае рашэнне ў выбары будучай прафесіі.